**Пятрова, А.** Людзі – зоркі / А. Пятрова // Герой працы (Шуміліна). — 1992. — 22 лют. — С. 2.

**ЛЮДЗІ – ЗОРКІ**

***Людзі – зоркі:***
***запаляцца ў свеце,***
***Замігацяць навокал, зазіхацяць.***
***І колькі трэба Зямлі***
***пасвецячы,***
***Скацяцца зноў з небасхілу***
***жыцця.***
**К. Цвірка.**

**«Добры дзені» мае родныя!**

**Атрымаў ад вас тры пісьмы запар. Гэта з-за надвор'я. Цяпер часта здараецца, таму паштовыя самалёты затрымліваюцца...**

**Тут таксама бывае зіма, уноч з 31 студзеня на 1 лютага пачаўся моцны снегапад, а зараз ідуць дажджы, навокал адна гразь з гліны, у любым месцы бяры і сценкі ляпі.**

**Хаця надвор'е і не песціць, але працаваць даводзіцца досыць як многа, у гэтым годзе душманам няма супакою і зімой...**

**Пішыце. Да пабачэння.»**

Гэта ўрывак з пісьма да бацькоў Анатоля Скобава – аднаго з тых, на чыю долю выпаў Афганістан.

Сёння ніхто не хоча браць на сябе адказнасць за тую нядаўнюю афганскую вайну, якая забрала сотні і сотні салдацкіх жыццяў. Яны так былі выхаваны, што верылі свайму ўраду, верылі ў праваты сваёй справы, верылі і шлі ў бой не шкадуючы сябе. Сярод іх быў і наш зямляк Анатоль Скобаў.

Анатоль Скобаў нарадзіўся 3 ліпеня 1951 года ў вёсцы Дубрава Мікалаеўскага сельскага Савета ў простай сялянскай сям'і, якая выхавала свайго сына сумленным чалавекам, сапраўдным патрыётам. Анатоль экстэрнам закончыў вышэйшае ваеннае авіяцыйнае вучылішча ў Сызрані.

У Афганістане ён у званні маёра камандаваў паветранай эскадрылляй.

«...Правінцыя Бадахшан. Крайні паўночны ўсход. Самы высакагорны раён краіны. Непрыступныя хрыбты, цясніны, леднікі, вечныя снягі. Тут амель зусім няма далін, дзе б радзіўся хлеб. Людзі адпраўляліся ва ўрадлівыя правінцыі Тахар, Кундуз за хлебам. Шлях займаў да некалькі месяцеў. А колькасць рабаўнікоў на дарогах вырасла за лік душманаў.

У Кундузе сабралася шмат жыхароў Бадахшанскіх уездаў. Яны звярнуліся за дапамогай да камандавання савецкага абмежаванага воінскага кантынгента. Задачу выкананя «хлебных рэйсаў даручылі лепшым экіпажам, у тым ліку і экіпажу Анатоля Скобава...»

Так пісаў пра нашага шумілінскага юнака падпалкоўнік Скрыжалін у газеце «Красная звязда».

А дома ў далёкай вёсачцы Дубрава бацькі Анатоля з хваляваннем чыталі яго доўгачаканае пісьмо:

**«Добры дзень, дарагія тата, матуля!**

**Сёння атрымаў адразу чатыры пісьмы, пакуль ёсць час усім пішу адказы. Ваня піша, што атрымаў новую кватэру і што шмат работы. У водпуск паедзе ў ліпені.**

**а я ў верасні тамсама іду ў водпуск. Крыху больш двух месяцаў засталося. Безумоўна, зараз складаней – плюс 40 градусаў, без абутку па зямлі можна хадзіць хіба што падскокам…**

**Але мы ўжо неяк звыкліся, асабліва не скардзімся...**

**Да пабачэння. Усім вялікае прывітанне.**

**Толік.**

**24.06.84 г.»**

Чыталі бацькі пісьмо і ў думах былі побач з сынам, а сэрцам падганялі тыя дні, што засталіся да сустрэчы.

«…А я ў верасні таксама іду ў водпуск. Крыху больш двух месяцаў засталося...»

Бязлітасны лёс распарадзіўся інакш. 14 ліпеня 1984 года Анатоль Скобаў загінуў на цяжкай, незразумелай афганскай вайне.

«...Верталёты маёра Анатоля Скобава і яго вядомага маёра Віктара Вароніна былі загружаны, што называецца, «пад завязку». Маршрут на большай сваёй частцы малавядомы, лятаць раней там не даводзілася...

Калі вярнуліся ў Кундуз за наступнай партыяй грузу і людзьмі штурман вядучага экіпажа капітан Аляксандр Котаў разлічыў другі маршрут – напрасткі. Ён намнога карацей, але пралягаў над незнаёмымі горнымі масівамі, дзе хаваліся душманы...

І зноў, са звонкім свістам рассякаючы вінтамі паветра, адрываючыся ад зямлі, па ўзыходзячай спіралі набіраюць вышыню і бяруць курс на ўсход, дзе цяжкадаступныя цясніны будуць выпрабоўваць іх майстэрства, мужнасць, сілу духа, дзе іх з нецярпеннем чакаюць людзі…»

Гэта быў апошні палёт Анаголя Скобава.

Паклянёмся, сябры,
Не забыць хлопцаў тых,
Хто жыццё палажыў
На афганскай зямлі.

**А. Пятрова**